АСОБЫ

# ...РНАЛІСТ. ...СЛЕДЧЫК. ...СЬМЕННІК



УНІВЕРСІТЭТ

ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

## ДЛЯ БУДУЧЫХ ЖУРНАЛІСТАЎ

**У Маладзечне адбыўся выязны семінар раённых і гарадскіх газет Мінскай вобласці сумесна з факультэтам журналістыкі БДУ "Рэдакцыя газеты — школа юнага журналіста".**

Падчас сустрэчы выкладчыкі факультэта журналістыкі разам з жур-

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта 10 сакавіка 2006 года, № 6 (1936)

ПАДЗЕІ

# III УСЕБЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ СХОД: РАСПАВЯДАЮЦЬ УДЗЕЛЬНІКІ

***Як паведамляла газета "Універсітэт", на III Усебеларускім народным сходзе, які адбыўся 2—3 сакавіка, наш універсітэт прадстаўлялі 4 дэлегаты: рэктар БДУ прафесар Васіль Іванавіч Стражаў, старшыня ГА "Саюз жанчын БДУ" Святлана Рыгораўна Савіна, дэкан факультэта журналістыкі дацэнт Сяргей Валянцінавіч Дубовік, студэнтка III курса юрыдычнага факультэта Людміла Арлоўская.***



**Рэктар БДУ прафесар Васіль СТРАЖАЎ:**

— Мне спадабаўся канструктыўны падыход да развіцця краіны, выкладзены як у дакладзе Прэзідэнта, так і падчас абмеркавання гэтага даклада. Неабходна адзначыць, што ўсе выступы мелі вельмі крытычны характар і галоўнай мэтай іх была не канстатацыя наяўнага (у цэлым добрага) становішча, а абмеркаванне ящчэ не вырашаных пытанняў, прапаноў па іх вырашэнні для далейшага руху наперад нашай краіны ва ўсіх напрамках — як у народнай гаспадарцы, так і ў сацыяльнай сферы.

**— Што з прамовы Прэзідэнта Вам найбольш запомнілася?**

— Прэзідэнт краіны ў сваім выступе некалькі разоў паўтарыў, што для нас на сённяшні момант галоўнымі прыярытэтамі становяцца навука і адукацыя, адукацыя і навука. Гэта адпавядае сённяшняй рэчаіснасці, калі наступны крок наперад можна зрабіць толькі на аснове інавацыйных падыходаў, інавацыйнай эканомікі.

**— Якія ў сувязі з гэтым задачы ставяцца перад БДУ?**

— Калі мы рухаемся да інавацыйнай эканомікі, то трэба мець на ўвазе, што такая эканоміка патрабуе спецыялістаў, падрыхтаваных іншым чынам. Такіх спецыялістаў неабходна выхоўваць у творчай атмасферы, вучыць самастойнасці ў прыняцці рашэнняў. Гэта можна зрабіць пры такой арганізацыі навучальнага працэсу, якая падштурхоўвае студэнта менавіта ў гэтым кірунку. І планы, якія ёсць сёння ва універсітэце па ператварэнні навучальнага працэсу на падставе інфармацыйных тэхналогій, развіцця самастойнай творчай кантраляванай працы студэнтаў, якраз і адпавядаюць гэтай задачы.

На сённяшні момант Беларускі дзяржаўны універсітэт у большай ступені, чым раней, атрымлівае падтрымку ад дзяржавы ў развіцці матэрыяльна-тэхнічнай базы. Гэта тычыцца як капітальнага будаўніцтва, капітальнага рамонту, так і набыцця неабходнага абсталявання для навуковай сферы і навучальнага працэсу.

Вынікі сходу дазваляюць сцвярджаць, што задачы, запланаваныя на наступныя 5 гадоў, будуць вырашаны як у маштабах дзяржавы, так і ў нашым універсітэце.

**Тацццяна КАЗАК**
**Фота Аляксандра СНАПКА**



**Старшыня грамадскага аб'яднання "Саюз жанчын БДУ" Святлана САВІНА:**

— Народны сход (у даўніну веча) — гэта старажытная славянская традыцыя. На сучасным этапе яна была рэалізавана ў форме своеасаблівай справаздачы Прэзідэнта Беларусі перад народам пра тое, што было зроблена за мінулыя 5 гадоў, і непасрэдна як нарада з беларускім народам, бо на сходзе былі вызначаны планы перспектыўнага развіцця краіны на наступную пяцігодку.

Прыемна, што ў час глабалізацыі Беларусь захавала вернасць сваім спрадвечным нацыянальным традыцыям і не пакінула свой уласны шлях развіцця, а ўпэўнена ідзе па ім.

**— Якія тэмы, закранутыя на сходзе, зацікавілі Вас найбольш?**

— Мне было цікава пачуць аб развіцці навукі — і прыкладной, і фундаментальнай, а таксама аб праграмах, якія датычацца вышэйшай школы. На сходзе гаварылася таксама пра размеркаванне выпускнікоў ВНУ. І падкрэслівалася, што рэалізацыя ўсіх праграмаў і рэформаў магчыма толькі пры дзяржаўным падыходзе да іх вырашэння.

**— Якія задачы былі пастаўлены на сходзе ў якасці прыярытэтных на наступныя 5 гадоў?**

— Асноўнай была вызначана задача сацыяльная: чалавек у комплексе сучасных праблем. Найперш гэта ахова здароўя, дэмаграфічныя праблемы, адукацыя, навейшыя тэхналогіі.

**— Ці патрэбны такія сходы?**

— У такіх сходаў моцная інтэграцыйная аснова. Нішто так не аб'ядноўвае і не натхняе людзей, як агульныя мэты і задачы.

**Марыя САСНОЎСКАЯ**
**Фота Сняжаны ЛІСОЎСКАЙ**



**Дэкан факультэта журналістыкі дацэнт Сяргей ДУБОВІК:**

— Задаволіла шырокае прадстаўніцтва: 2,5 тысячы дэлегатаў плюс запрошаныя — гэта амаль 3 тысячы ўдзельнікаў. У сходзе ўзялі ўдзел студэнты, рабочыя, ветэраны, ваеннаслужачыя, прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў і інш. Прысутнічалі таксама госці з краін СНД, прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса заходніх краін, акрэдытаваныя ў Беларусі. На мой погляд, гэта выдатная традыцыя — раз у 5 год збіраць вялікі савет, нешта накшталт старадаўняга веча, на якім падводзяцца вынікі зробленага і ставяцца новыя задачы па развіцці нашай краіны на гэты перыяд.

Сяргей Валянцінавіч быў дэлегатам і II Усебеларускага сходу:

— Задачы, пастаўленыя тады, удалося выканаць і нават перавыканаць. Асноўныя паказчыкі ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы сведчаць, што Беларусь развіваецца дынамічна, пры гэтым яе эканоміка арыентавана на чалавека. Я падкрэсліваю, што ў нашай краіне ўсё робіцца для простага чалавека. Гэта гучала лейтматывам і ў выступе Прэзідэнта, і ў прамовах дэлегатаў сходу. Шмат увагі на сходзе надавалася праблемам моладзі, ветэранаў, абмяркоўваліся пытанні адукацыі, навукі, прамысловасці, сельскай гаспадаркі.

**— А пра вышэйшую школу размова ішла?**

— Так, дзяржава чакае ад вышэйшай школы падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў, выхавання ў студэнтаў акрэсленай грамадзянскай пазіцыі. У сваім дакладзе Прэзідэнт казаў пра пастаянны рост стыпендый, адзначаў, што ў бліжэйшай перспектыве плануецца павысіць заробак прафесарска-выкладчыцкага саставу.

**— Што больш за ўсё цікавіла людзей?**

— Падчас сходу працавала тэлефонная "гарачая лінія". Дазваніцца маглі з любога рэгіёну Беларусі, звязацца з сакратарыятам і задаць свае пытанні. Былі і канкрэтныя прапановы з месцаў. Плануецца выдаць дакумент, які зафіксуе асноўныя прапановы, пытанні, праблемы. Больш за ўсё пытанняў прысвячалася сацыяльнай сферы, жыццю простага чалавека.

**— Якія асноўныя рашэнні прынялі на сходзе?**

— Пераважна ў сферы эканомікі: рост ВУП, сярэдняй заработнай платы, развіццё навукі, абнаўленне асноўных фондаў прамысловасці і сельскай гаспадаркі — рашэнні, якія дазволяць краіне ў далейшым развівацца больш дынамічна, чым раней.

*Ала МАЧАЛАВА*
*Фота Юліі ПАПОВАЙ*

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

### САМЫ МАЛАДЫ ФАКУЛЬТЭТ

**Інтэрв'ю з дэканам гуманітарнага факультэта дацэнтам Уладзімірам Яўгенавічам ГУРСКІМ.**

**Стар. 2**

### ЖУРНАЛІСТ. ДАСЛЕДЧЫК. ПІСЬМЕННІК

**Прафесар кафедры перыядычнага друку факультэта журналістыкі Барыс Васільевіч СТРАЛЬЦОЎ адзначыў свой юбілей.**

**Стар. 3**

## ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

Афіцыйнае адкрыццё дзвюх медыятэк — спецыяльна абсталяваных камп'ютарных класаў для студэнтаў пройдзе ў БДУ 10 сакавіка. Адна такая медыятэка створана на геаграфічным факультэце (вул. Ленінградская, 16), другая — на гуманітарным (вул. Курчатава, 5). Трэцяя медыятэка (у будынку БДУ па вул. Рэвалюцыйнай, 13) пачне працаваць у наступным месяцы. Гэта вельмі важны крок у інфармацыйнай падтрымцы самастойнай працы студэнтаў.

Першы міжнародны турнір па футболе сярод жаночых каманд на прызы БДУ праходзіць з 8 па 10 сакавіка ў Мінску. У ім прымае ўдзел і футбольная жаночая каманда "Зорка БДУ". Вынікі спаборніцтваў будуць падведзены 10 сакавіка.

Дэлегацыя нашага універсітэта на чале з першым прарэктарам Сяргеем Рахманавым прымае ўдзел у выставе Рэспублікі Беларусь, якая праходзіць у Чалябінску. На ёй экспануюцца дасягненні БДУ ў навуковай сферы.

Плануецца, што 13 сакавіка госцем БДУ будзе мэр Масквы, ганаровы доктар БДУ Юрый Лужкоў. Ён пазнаёміцца з дасягненнямі нашага універсітэта, а таксама выступіць з лекцыяй перад студэнтамі і супрацоўнікамі БДУ.

Зацверджаны "Парадак прыёму ў БДУ на 2006 г.", і ў нашым універсітэце стартавала прыёмная кампанія. Прыём дакументаў пачнецца з 12 ліпеня, а апошняе залічэнне студэнтаў адбудзецца 11 жніўня.

**Падрыхтавала**
**Тацццяна КАЗАК**

АСОБЫ

# ЖУРНАЛІСТ. ДАСЛЕДЧЫК. ПІСЬМЕННІК

## БАРЫСУ СТРАЛЬЦОВУ — 80!



***Прафесару кафедры перыядычнага друку факультэта журналістыкі Барысу Васільевічу Стральцову споўнілася 80 гадоў. Тысячы яго вучняў працуюць ва ўсіх сродках масавай інфармацыі Беларусі. Да юбілею на факультэце журналістыкі студэнты падрыхтавалі спецыяльны выпуск вучэбнай газеты "Журналіст". Прапануем вашай увазе кароткі пераказ матэрыялаў гэтага спецвыпуску.***

Нарадзіўся Барыс Стральцоў у вёсцы Хутар Быхаўскага раёна ў сялянскай сям'і. Як і многія сялянскія хлопчыкі, заняткі ў школе ўлетку дапаўняў працай у калгасе. Перад самай вайной скончыў восьмы клас. А ў дзевятым давялося вучыцца ўжо толькі пасля вайны і службы ў войску. Атэстат сталасці ён атрымаў ужо ў бабруйскай вячэрняй школе. Пра тыя гады распавядае так: "Дзевяты я закончыў у войску, дзе стварылі школу для афіцэраў, якія не мелі сярэдняй адукацыі. Потым дазволілі вучыцца сяржантам і старшынам. Гэта цяпер палохаюць: вучыся, а то... Я сам імкнуўся атрымаць веды. Дзесяты клас я закончыў з срэбраным медалём!"

Потым вучыўся на філалагічным факультэце БДУ (1951—1956). "Я, калі паступаў на завочнае аддзяленне філфака ў 1951 г., ужо працаваў у газеце "Савецкая Радзіма" ў Бабруйску. Хутка я зразумеў, што вучыцца завочна — гэта тое ж самае, што і есці завочна, таму пераве́ўся на стацыянар. Але сапраўдным студэнтам пабыў толькі месяц, бо ўвесь астатні час быў непарыўна звязаны з працай", — згадвае Б. Стральцоў.

Цяжкое матэрыяльнае становішча змусіла яго сумяшчаць студэнцкую лаву з працай: тры гады падчас навучання ён працаваў у газеце "Чырвоная Змена": "Паколькі на трэцім курсе мяне запрасілі ў газету "Чырвоная Змена" (я пачынаў літаратурным работнікам), то, здаралася, студэнты прыходзілі на практыку да мяне".

Потым Барыс Васільевіч перайшоў на працу ў "Звязду": тут ён выконваў абавязкі літсупрацоўніка, загадчыка аддзела літаратуры і мастацтва, адначасова працуючы над кандыдацкай дысертацыяй на тэму "Газета і мараль" (абараніў у 1968 г.). "Я 20 гадоў адпрацаваў у газетах: "Савецкая Радзіма", "Чырвоная Змена", "Звязда"... Гэта былі незвычайныя калектывы, дзе адзін за ўсіх і ўсе за аднаго. Атмасфера ў рэдакцыях была сяброўская, амаль сямейнай, поспехі і гора — агульныя", — успамінае юбіляр.



Расповеды Барыса Васільевіча перадаюць атмасферу таго часу: "У мяне была адна друкарская машынка. Мне не трэба была машыністка, я ўсімі пальцамі працаваў! Калі пісаў нейкі аператыўны матэрыял — сядаў за машынку. Але калі пісаў нешта сур'ёзнае, дзе трэба было засяродзіцца, то ручку ў руку — і наперад! Аднойчы, калі я працаваў у "Чырвонай Змене", мы з фотакарэспандэнтам цэлы месяц калясілі па Беларусі. Ён фатаграфаваў, я пісаў. Спыняліся ў рэдакцыях. Бывала нават — дзе-небудзь у лесе, у "палявых умовах", ставіў машынку на пень, які замяняў мне пісьмовы стол... Гатовыя матэрыялы перадавалі ў Мінск праз вадзіцеляў аўтобусаў. І за месяц — шаснаццаць рэпартажаў".

А ў 1969 г. Б. Стральцоў зноў вярнуўся ў БДУ — цяпер ужо як выкладчык факультэта журналістыкі. Напрыканцы таго ж 1969 г. ён узначаліў кафедру тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі. Тут па-сапраўднаму раскрыўся яго талент арганізатара і выхаваўцы. З імем Барыса Васільевіча звязана станаўленне беларускай журналісцкай навукі, яго манаграфіі і артыкулы ведаюць далёка па-за межамі Беларусі. У 1978 г. Б.Стральцоў абараніў доктарскую дысертацыю, а ў наступным годзе атрымаў званне прафесара.

Акрамя настаўніцкай і даследчыцкай працы Б. Стральцоў вядомы і як пісьменнік, аўтар мастацкіх твораў, яго пяру належаць 4 сцэнарыі дакументальных фільмаў і 5 мастацка-публіцыстычных альбомаў, прысвечаных Беларусі. Дзейнасць Барыса Васільевіча адзначана прэміяй "За адметны ўклад у развіццё журналістыкі" Канфедэрацыі журналісцкіх саюзаў. Акрамя таго, ён адзначаны званнямі заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь, лаўрэата спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Беларусі дзеячам культуры і мастацтва (у намінацыі "Журналістыка").

Падрыхтавала Алена КУРХІНЕН

ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

## ДЛЯ БУДУЧЫХ ЖУРНАЛІСТАЎ

***У Маладзечне адбыўся выязны семінар раённых і гарадскіх газет Мінскай вобласці сумесна з факультэтам журналістыкі БДУ "Рэдакцыя газеты — школа юнага журналіста".***

Падчас сустрэчы выкладчыкі факультэта журналістыкі разам з журналістамі-практыкамі мясцовых выданняў, рэспубліканскіх маладзёжных і дзіцячых газет шукалі адказы на пытанне, як удасканаліць пошук і падтрымку таленавітай моладзі з глыбінкі, здольнай пасля навучання ў ВНУ стаць сапраўднымі прафесіяналамі сваёй справы, плённа працаваць у рэдакцыях газет і часопісаў, на радыё і тэлебачанні.

У семінары прынялі ўдзел дэкан факультэта журналістыкі дацэнт С.В. Дубовік, начальнік ідэалагічнага ўпраўлення Мінаблвыканкама Т.У. Дзедух, намеснік старшыні Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз журналістаў" і кіраўнік Мінскай абласной арганізацыі БСЖ Р.В. Сакалоўскі, сакратар Мінскага абласнога камітэта БРСМ А.У. Хамічук, галоўны рэдактар газеты "Пераходны возраст" Г.В. Ппонік, галоўны рэдактар газеты "Зорька" Л.М. Грамовіч. Надзённыя пытанні супрацоўніцтва рэдакцый мясцовых газет з аўтарамі-пачаткоўцамі закранулі ў сваіх выступах галоўны рэдактар "Маладзечанскай газеты" А.А. Хазянін, рэдактар газеты "Навіны Старадарожчыны" М.У. Татур, рэдактар вілейскай раённай газеты "Шлях перамогі" М.Р. Кузаўкіна.

Пасля заканчэння семінара са школьнікамі Маладзечанскага раёна быў праведзены "Дзень адкрытых дзвярэй" факультэта журналістыкі БДУ, на якім перад прысутнымі выступілі дэкан факультэта журналістыкі дацэнт С.В. Дубовік, намеснік дэкана дацэнт Н.А. Зубчонак, загадчыкі кафедраў факультэта — доктар філалагічных навук Т.М. Дасаева, дацэнты А.К. Свораб, В.Р. Булацкі, В.Р. Вашкевіч. Яны пазнаёмілі школьнікаў з умовамі прыёму на факультэт журналістыкі ў 2006 г., адказалі на шмат-лікія пытанні пра асаблівасці правядзення творчага конкурсу.

**Пётр ДАРАШЧОНАК,**
**загадчык кафедры гісторыі журналістыкі і літаратуры факультэта журналістыкі, дацэнт**

ГОСЦІ

## ФІЛОЛАГ ДА ФІЛОЛАГАЎ

***Сустрэча кандыдата філалагічных навук Маншук Алдамжаравай са студэнтамі адбылася 28 лютага на філфаку па ініцыятыве Саюза жанчын БДУ і кафедры сучаснай беларускай мовы.***

Жонка пасла Рэспублікі Казахстан у Беларусі ўмацоўвала сяброўства паміж краінамі з дапамогаю сваіх вершаў і карцін, чытала ўрыўкі з кнігі, над якой працуе цяпер, распавядала пра сваю сям'ю, пра гады педагагічнай працы. Зацікавіла аўдыторыю параўнальная характарыстыка ментальнасці беларусаў і казахаў. Беларусы, лічыць жонка пасла, вылучаюцца грунтоўнасцю ва ўсім, што робяць, а аб'ядноўвае абодва народы стрыманасць у выяўленні пачуццяў, што ёсць праявай мудрасці, і неагрэсіўнасць.

Сустрэча адбылася ў сценах філфака не выпадкова. Маншук Алдамжарава 22 гады аддала школе, дзе працавала настаўніцай рускай мовы і літаратуры, і 12 год выкладала ў Алмацінскім дзяржаўным універсітэце імя Абая, цяпер працуе над доктарскай дысертацыяй, прысвечанай тэарэтычнай стылістыцы. Яна прыйшла да калег, да філолагаў. На сустрэчы напярэдадні 8 сакавіка жонка пасла павіншавала ўсіх са святам вясны, пажадала шчасця і дабрабыту, падаравала бібліятэцы серыю кніг пісьменнікаў Казахстана.

Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ

## БДУ ў СМІ Беларусі

Пра бліскучую перамогу студэнтаў юрфака БДУ на студэнцкай юрыдычнай алімпіядзе паведамілі газеты **"Звязда"** (04.03.2006), **"Настаўніцкая газета"** (21.02.06), інфармагенцтва **БЕЛТА** (20.02.2006).

Пра конкурс "Супермен БДУ", які адбыўся ў студгарадку ў рамках святкавання Дня абаронцаў Айчыны, паведамілі інфармацыйнае агенцтва **БЕЛТА** (23.02.2006), **"БелГазета"** (27.02.2006), газеты **"Минский курьер"** (02.03.2006), **"Вечерний Минск"** (22.02.2006).

Газета **"Вечерний Минск"** у артыкуле "Падарунак Мінску ад Маншук" (23.02.2006) распавяла пра выставы, прысвечаныя беларуска-казахскім адносінам.

Рэпартажы з святкавання 50-годдзя Аб'яднанага інстытута ядзерных даследаванняў (Дубна, Маскоўская вобласць Расіі), якія адбыліся сумесна з БДУ, прайшлі на тэлеканалах **АНТ** (01.03.2006) і **СТВ** (28.02.2006), а таксама падзея знайшла сваё адлюстраванне ў газетах **"Рэспубліка"** (01.03.2006), **"Знамя юности"** (03.03.2006).

Інтэрв'ю з дэлегаткай III Усебеларускага народнага сходу Людмілай Арлоўскай, студэнткай III курса юрыдычнага факультэта БДУ, было змешчана на старонках газеты **"Звязда"** (24.02.2006).

Пра навукова-асветніцкую Міжнародную мінералагічную выставу-кірмаш "Каменная казка", якая праходзіла 1—5 сакавіка ў галоўным корпусе БДУ, з'явілася інфармацыя ў газеце **"Минский курьер"** (23.02.2006).

**"Настаўніцкая газета"** (02.03.2006) паведаміла пра поспех каманды ліцэістаў БДУ на XIV Рэспубліканскім турніры юных фізікаў, які адбыўся з 19 па 22 лютага.

Выязны семінар-практыкум "Зімовая школа студэнцкай журналістыкі" стаў тэмай матэрыялаў у газетах **"Звязда"** (24.02.2006), **"Вечерний Минск"** (01.03.2006), **"Советская Белоруссия"** (21.02.2006), **"Народная газета"** (21.02.2006), агенцтва **БЕЛТА** (19.02.2006).

У рэспубліканскіх СМІ з'явіліся публікацыі пра БДУ і на іншыя тэмы.

Агляд падрыхтавала Ірына ШЫК

## ПАМЯЦЬ ПРА ГІСТОРЫКА

***24-25 лютага ў БДУ адбылася міжнародная навуковая канферэнцыя "Крыніцазнаўства, археаграфія, архівазнаўства ў XX—XXI стст. у Беларусі", прысвечаная стагоддзю з дня нараджэння нашага земляка — знакамітага гісторыка, археолага, этнографа і краязнаўцы Мікалая Улашчыка (1906—1986).***

Удзел у ёй прынялі гісторыкі, літаратуразнаўцы, навуковыя супрацоўнікі вядучых ВНУ краіны, архіўных, музейных, бібліятэчных устаноў Беларусі, Расіі і Украіны. На сустрэчы абмяркоўваліся актуальныя праблемы развіцця гістарычных дысцыплін, пытанні ўзаемадзеяння і інтэграцыі архіваў, захоўвання ведаў у сучасным грамадстве.

У рамках канферэнцыі працавала секцыя, дзе ішла гаворка пра ўнёсак М. Улашчыка ў беларускую гістарыяграфію, краязнаўства, археаграфію і іншыя спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны. Удзельнікі таксама наведалі дакументальную і кніжную выставы на гістарычным факультэце БДУ і ў чытальнай зале аддзела рэдкай кнігі акадэмічнай бібліятэкі пад назвай "Старанны даследчык беларуская мінулага". Акрамя таго, госці наведалі радзіму Улашчыка — вёску Віцкаўшчына ў Дзяржынскім раёне, сустрэліся з выкладчыкамі гісторыі сярэдніх школ.

Ірына ШЫК

## КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

# ВЫДАДЗЕНА Ў БДУ

**Литература Прибалтики.** *Составитель И.М. Ключенович.* У хрэстаматыю ўвайшлі ўрыўкі з твораў выдатных майстроў мастацкага слова Літвы, Латвіі, Эстоніі. Разнастайныя па тэмах, жанрах і манеры творы даюць уяўленне пра шляхі развіцця прыбалтыйскіх літаратур.

*Р.М. Кавалёва.* **Беларуская вуснапаэтычная творчасць.** Вучэбна-метадычны комплекс змяшчае праграму курса, модульны практыкум з распрацоўкай ключавых тэм, інфармацыйныя і метадычныя матэрыялы, тэсты, заданні для самастойнай работы, тэматыку курсавых, дыпломных і навукова-даследчых работ.

*Л.В. Павлова.* **Право прав человека.** У навучальным дапаможніку раскрываюцца спецыфіка, крыніцы, прынцыпы права правоў чалавека як галіны міжнароднага права, а таксама міжнародны механізм абароны правоў чалавека.




**Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны. Выпуск 2.** У навуковым зборніку (першы выпуск з'явіўся ў 2002 г.) працягваецца абмеркаванне актуальных тэарэтычных і прыкладных праблем па крыніцазнаўстве і спецыяльных гістарычных дысцыплінах.

*А.Г. Медведев.* **Оптимизация стратегий инвестирования.** У навучальным дапаможніку з грыфам Міністэрства адукацыі Беларусі асноўная ўвага надаецца праблеме найлепшага выбару партфеляў з фінансавых інструментаў, уключаючы акцыі, аблігацыі і фінансавыя вытворныя ва ўмовах выпадковых паводзін працэнтных ставак.

*П.А. Каўрыга.* **Метэаралогія.** У навучальным дапаможніку, дапушчаным Міністэрствам адукацыі, тлумачыцца фізічная сутнасць атмасферных з'яў і працэсаў, якія фарміруюць надвор'е і клімат Зямлі. Разглядаюцца фізічныя і хімічныя ўласцівасці паветра, склад і будова атмасферы, яе радыяцыйны і цеплавы рэжымы, вільгацезварот, вільготнасць паветра і працэсы кандэнсацыі вадзяной пары.

*Г.П. Волчкова, В.М. Котов, Е.П. Соболевская.* **Сборник задач по теории алгоритмов.** У зборнік увайшлі задачы па чатырох асноўных тэмах, якія вывучаюцца ў курсе "Тэорыя алгарытмаў". Большасць з прыведзеных задач носяць творчы характар.

**Теория литературы.** Вучэбная праграма, зацверджаная Вучэбна-метадычным аб'яднаннем ВНУ Рэспублікі Беларусь па гуманітарнай адукацыі, прызначаецца для студэнтаў-філолагаў вышэйшых навучальных устаноў.

**Чертко Николай Константинович: К 70-летию со дня рождения.** У бібліяграфічным паказальніку не толькі прыводзіцца пералік апублікаваных навуковых, навучальных, навучальна-метадычных, навукова-папулярных работ і навуковых дакладаў доктара геаграфічных навук М.К. Чартко, але і даецца кароткі нарыс яго навуковай, педагагічнай і грамадскай дзейнасці.

**Духовно-нравственное образование детей на православных традициях.** Каталог літаратуры, рэкамендаванай для педагагічных работнікаў сістэмы адукацыі, змяшчае звесткі пра кнігі, выпушчаныя ў апошняе 10-годдзе. Гэтая літаратура дапаможа педагогам вырашаць задачы духоўна-маральнай адукацыі дзяцей на праваслаўных традыцыях нашага народа.

**Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы**

## НАВІНЫ СТУДГАРАДКА

# СУПЕРМЕНЫ З БДУ

***Конкурс "Супермен-2006" прайшоў напярэдадні Дня абаронцаў Айчыны ў студгарадку БДУ.***



У спаборніцтве ўзялі ўдзел 9 студэнтаў нашага універсітэта, якія ўжо прайшлі адборачныя туры ў снежні-студзені. Кожны з хлопцаў прадстаўляў асобны інтэрнат.

Конкурс складаўся з трох выпрабаванняў. У першым ("Вобраз") удзельнікі ўсімі сродкамі імкнуліся паказаць сябе з найлепшага боку. Розум, эрудыцыю, кемлівасць і гумар канкурсанты прадэманстравалі ў другім заданні — "Інтэлектуальным", дзе трэба было закончыць афарызм або выказванне знакамітага чалавека. У апошнім і, бадай, самым яскравым выпрабаванні "Прызнанне ў каханні" хлопцы раскрылі ўсю моц свайго таленту: яны дэкламавалі вершы, спявалі, гралі на музычных інструментах, паказвалі тэатральныя мініяцюры — рабілі ўсё, каб каханая (і журы з гледачамі) паверыла ў іх пачуцці.

Усе канкурсанты здолелі прайсці гэтыя нялёгкія заданні. А лепшым за ўсіх на погляд журы быў Андрэй Рудзь з гістфака (інтэрнат №1), які атрымаў тытул "Супермена-2006". "Містэрам-2006" стаў студэнт эканамічнага факультэта Сяргей Майсяёнак (інтэрнат №5), а "Містэрам Галантнасць" абраны Аляксандр Мініч (інтэрнат №7) з мехмата. Прыз глядацкіх сімпатый атрымаў Андрэй Кіслы (інтэрнат №3) з фізфака, а спецыяльны прыз ад газеты "Мужчынскі клуб" — радыёфізік Ігар Дубовік (інтэрнат №10). Усе ўдзельнікі атрымалі ад спонсараў прыемныя падарункі: грашовыя прэміі, наборы касметыкі, падпіску на газету "Мужчынскі клуб", букеты кветак.

**Настасся ЮДЧЫЦ**

**Фота аўтара**



## АБ'ЯВЫ

# СПЕЦВЫПУСК ДЛЯ АБІТУРЫЕНТАЎ

Рэдакцыя газеты "Універсітэт" сумесна з прыёмнай камісіяй БДУ выдала спецыяльны выпуск газеты для абітурыентаў. У ім змешчаны Парадак прыёму ў БДУ ў 2006 г., пералік уступных выпрабаванняў на дзённую і завочную формы навучання, пералік спецыяльнасцяў, па якіх пазаконкурсны прыём сёлета адбывацца не будзе, а таксама графік правядзення "Дзён адкрытых дзвярэй" у БДУ па факультэтах.

Рэдакцыя газеты "Універсітэт" рыхтуе да друку яшчэ некалькі спецвыпускаў для абітурыентаў, дзе плануецца размясціць інфармацыю пра факультэты, прыкладныя заданні ўступных выпрабаванняў у БДУ, план прыёму, кошт навучання, звесткі пра конкурс за мінулыя гады і інш.

Спецыяльны выпуск газеты "Універсітэт" для абітурыентаў можна набыць у кніжных кіёсках "Універсітэцкая кніга", размешчаных у фае галоўнага корпуса БДУ (праспект Незалежнасці, 4), у карпусах юрыдычнага факультэта (вул. Ленінградская, 8), хімічнага факультэта (вул. Ленінградская, 14), філалагічнага факультэта (вул. К. Маркса, 31), а таксама ў інтэрнаце № 2 студгарадка БДУ (вул. Кастрычніцкая, 2).

## З УСМЕШКАЙ

***

Аб'ява ў студэнцкім інтэрнаце: "У чысты чацвер будзе мяняцца пасцельная бялізна. Трэці паверх мяняецца з чацвёртым, першы — з другім".

***

Калі студэнт пытаецца, ці можна яму выйсці з лекцыі, для выкладчыка галоўнае — паспець пагадзіцца.

***

Іспыт па гісторыі. Студэнт нічога не ведае. Выкладчык:

— Ну хоць пра пачатак Другой сусветнай раскажыце.

Студэнт, задумаўшыся:

— Навокал агонь, дым і танкі, танкі, танкі...

# ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ІНСТЫТУТ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ"

***запрашае на павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку ў красавіку—чэрвені 2006 г. выкладчыкаў і спецыялістаў устаноў адукацыі па наступных напрамках:***

**1.** Вучэбна-метадычны комплекс: тэорыя і практыка праектавання (для выкладчыкаў ВНУ) на базе БДАТУ — 1 этап: 03.04—08.04; 2 этап: 22.05—27.05;

**2.** Інавацыйна-адукацыйная дзейнасць: актуальныя пытанні менеджменту (для выкладчыкаў ВНУ) на базе Каманднa-інжынернага інстытута — 10.04-21.04;

**3.** Замежная мова (англійская мова) як аснова сацыяльнай дзелавой камунікацыі сучаснага спецыяліста (для выкладчыкаў, асістэнтаў, навуковых супрацоўнікаў ВНУ) — 10.04—17.06, заняткі 2 разы ў тыдзень;

**4.** Нямецкая мова (для выкладчыкаў, асістэнтаў, навуковых супрацоўнікаў, вучэбна-дапаможнага персаналу ВНУ) — 10.04—17.06, заняткі 2 разы ў тыдзень;

**5.** Актуальныя праблемы ідэалагічнай і выхаваўчай работы ва ўмовах ВНУ (для выкладчыкаў і супрацоўнікаў ВНУ) на базе БДУІР — 17.04—29.04;

**6.** Псіхалогія сямейных адносін і падрыхтоўка моладзі да шлюбу (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ, СШ і інш.) — 17.04—29.04;

**7.** Кіраванне кафедрай у сістэме вышэйшай адукацыі (для загадчыкаў кафедраў, рэзерву загадчыкаў кафедраў) — 1 этап: 24.04—29.04; 2 этап: 22.05—27.05;

**8.** Сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі ў забеспячэнні і выкладанні прыродазнаўчых дысцыплін (для выкладчыкаў ВНУ) — 1 этап: 24.04—29.04; 2 этап: 12.06—17.06;

**9.** Дзяржаўная палітыка ў сферы вышэйшай адукацыі (для рэктараў, прарэктараў, рэзерву прарэктараў, дэканаў ВНУ) — 15.05—20.05;

**10.** Гісторыя беларускай дзяржаўнасці і патрыятычнае выхаванне (для выкладчыкаў і спецыялістаў вышэйшай школы) — 15.05—27.05;

**11.** Актыўныя метады навучання ў вышэйшай школе (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ) — 05.06—17.06.

### Перападрыхтоўка

Спецыяльнасць: "Эканамічная тэорыя", кваліфікацыя: "Эканаміст. Выкладчык эканамічных дысцыплін" — 03.04.2006—22.06.2007.

**Калі Вас зацікавіла наша інфармацыя і Вы гатовы прыняць удзел у курсах, тэлефануйце па № 222-83-03, 200-20-47 для папярэдняга запісу ў групы.**

**Наш адрас: 220007 г.Мінск, вул. Маскоўская, 15. Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, каб. 319, тэл./факс 200-25-51**

## У ВОЛЬНЫ ЧАС

# ФЕСТЫВАЛЬ ЭСТРАДЫ

У нашым універсітэце праходзіць Фестываль эстрады — 2006, прысвечаны 85-годдзю alma mater. 3 і 6 сакавіка адбыліся адборачныя туры, а сёння ў ліцэі БДУ ў 18 гадзін будзе наладжаны гала-канцэрт удзельнікаў фестывалю. У мерапрыемстве, арганізаваным упраўленнем па справах культуры, прынялі ўдзел каля 300 студэнтаў з усіх факультэтаў.

**Ірына ШЫК**

## АКЦЫІ

# КАНЦЭРТ АРТЫСТАЎ БДУ

Нядаўна артысты студыі эстраднай песні БДУ прынялі ўдзел у канцэрце "За Беларусь", які адбыўся ў Мінску на вул. Каржа. У мерапрыемстве (кіраўнік праекта Інэса Корчак) прынялі ўдзел Аляксандр Заўгародні, Мішэль, Яўген Леўчанка, Ганна Мартынава. Вядучым быў Максім Шышко, які ўжо мае вялікі досвед вядзення канцэртаў з разнастайнымі творчымі калектывамі нашага універсітэта.

Нягледзячы на марозны дзень, з першых жа слоў вядучага ўсталявалася цёплая, добразычлівая атмасфера. Яна панавала да апошняй ноты песні А.Заўгародняга. Пасля заканчэння канцэрта яшчэ доўга не сціхалі гарачыя апладысменты.

**Арцём МАЛІНІН**

## ШКОЛА ПЕРШАКУРСНІКА

# ЯК ЗАХАВАЦЬ МАЁМАСЦЬ

Узрослая колькасць крадзяжоў уласнай маёмасці студэнтаў прыцягнула ўвагу праваахоўных органаў, занепакоіла кіраўніцтва універсітэта, Службу аховы і бяспекі. Значная колькасць крадзяжоў мабільных тэлефонаў, дакументаў, грошай адбываецца ў інтэрнатах і навучальных карпусах. Часцей за ўсё злачынствы здзяйсняюцца з прычыны асабістай няўважлівасці і бесклапотнасці саміх студэнтаў, асабліва ў перыяд здачы экзаменаў.

Служба аховы і бяспекі просіць старастаў навучальных груп паў не забываць пра свой абавязак назіраць за захаванасцю вучэбнага абсталявання, інвентару і маёмасці студэнтаў. Падчас заняткаў у аўдыторыі альбо ў спартыўнай зале пажадана, каб там не было чужых людзей. Пры з'яўленні ў вашай групе альбо побач незнаёмых людзей не праяўляйце бесклапотнасці. Лягчэй папярэдзіць злачынства, чым ліквідаваць яго наступствы. Пры пераходзе з адной аўдыторыі ў іншую, пры змене месца ў аўдыторыі не пакідайце рэчы без нагляду, час ад часу правярайце іх наяўнасць.

Калі ў адносінах да вас было здзейснена злачынства альбо вы сталі яго відавочцам, просім неадкладна паведаміць у Службу аховы і бяспекі БДУ па тэлефоне 209-50-02 альбо 209-53-39.

Элементарныя меры засцярогі дапамогуць вам захаваць маёмасць і добры настрой.

**В. ПАЗНЯК**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

10 сакавіка 2006 года
Падпісана да друку 09.03.2006 г.
Зак.238. Тыраж 1000 экз. Ум. друк. арк. 1
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Таццяна КАЗАК
Камп'ютарная вёрстка Аляксандра Саламахіна
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная рэдакцыі: вул. Бабруйская, 7, пакой 411, тэлефон 209-53-45,
e-mail: Gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by